вочного занятия, учет условия режима жизни и спортивной деятельности и многое другое. Использование педагогических средств восстановления в процессе спортивной подготовки позволяет осуществлять эффективный контроль и коррекцию тренировочного процесса, предотвращая чрезмерное утомление, срыв адаптационных механизмов и, как следствие, перетренированность.

Важным моментом практической части изучаемого курса является разработка и проведение студентами комплексов физических упражнений для профилактики спортивного травматизма, представляющих собой специально подобранные и дозированные упражнения, направленные на укрепление определенных групп мышц, связок и суставов, участвующих в спортивной деятельности. Такие комплексы включают также элементы стретчинга, упражнения на релаксацию и снятие напряжения. Использование комплексов упражнений для профилактики спортивного травматизма является весьма актуальным направлением в рамках современной спортивной подготовки, так как способствует повышению эффективности тренировочного процесса, сохранению здоровья и работоспособности спортсменов, а также достижению высоких спортивных результатов.

Таким образом, дисциплина «Физическая реабилитация спортсменов» является необходимой и актуальной для студентов, обучающихся по специальности 1-88 02 01-01 Спортивно-педагогическая деятельность (тренерская работа с указанием вида спорта), так как формирует у них профессиональные компетенции по восстановлению работоспособности и здоровья спортсменов, а также повышает социальную значимость и востребованность будущих специалистов на рынке труда.

**Литература**

1. Кожедуб, М. С. Взаимосвязь профессиональной направленности специальности с уровнем мотивации студентов / М. С. Кожедуб, С. В. Мельников // Физическая культура и спорт в современном мире : Сборник научных статей / Редколлегия: Г.И. Нарскин (гл. ред.) [и др.]. – Гомель : Гомельский государственный университет им. Франциска Скорины, 2021. – С. 68–72.

2. Лечебная физическая культура в системе медицинской реабилитации : национальное руководство / под ред. В. А. Епифанова, М. С. Петровой, А. В. Епифанова. – Москва : ГЭОТАР–Медиа, 2022. – 896 с.

3. Общая теория спорта и ее прикладные аспекты : учебник для вузов физической культуры и спорта / Л. П. Матвеев. – 7-е изд. стереотип. – М .: Спорт, 2020. – 342 с.

4. Палашенко, М. Ю. Профилактика травмы «колено пловца» в плавании / М. Ю. Палашенко, С. В. Мельников // Теоретические и практические проблемы физической культуры и спорта: материалы Всероссийской научно-практической конференции с международным участием, посвященной 85-летию Благовещенского государственного педагогического университета / под общ. ред. О. В. Юречко. – БГПУ, 2015. – С. 233–239.

***УДК 378.147:94:321.01(476)***

***В. А. Міхедзька***
*г. Гомель, ГДУ імя Ф. Скарыны*

## НЕКАТОРЫЯ ПРАБЛЕМЫ ВЫКЛАДАННЯ ДЫСЦЫПЛІНЫ “ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ” СТУДЭНТАМ НЕГІСТАРЫЧНЫХ СПЕЦЫЯЛЬНАСЦЕЙ

З 1922-га навучальнага года ва ўстановах вышэйшай адукацыі адбылося перафарматаванне выкладання цыкла сацыяльна-гуманітарных дысцыплін. Замест ранейшага курса “Гісторыя Беларусі (у кантэксце еўрапейскай цывлізацыі)”, які існаваў яшчэ з

1990-х гг., быў заклiканы паглыбiць i сiтэматызаваць веды па айчыннай гiсторыi, вызначыць яе рысы як часткi еўрапейскай цывiлiзацыi i яе асаблiвасцi, уведзена выкладанне новай дысцыплiны – “Гiсторыя беларускай дзяржаўнасцi”. Вывучэнне дадзенай навучальнай дысцыплiны зарыентавана на фармаванне ўстойлiвых уяўленняў аб гiстарычным мiнулым i накiрунках наступнага развiцця беларускай дзяржавы, а яе мэтай – фармаванне “абгрунтаванай патрыятычнай пазiцыi” [1, с.3-4]. Распрацоўшчыкi курса “Гiсторыя Беларусi (у кантэксце еўрапейскай цывлiзацыi)” i “Гiсторыя беларускай дзяржаўнасцi” адзначалi патрэбу пазбегнуць дублявання са школьным курсам айчыннай гiсторыi. Але, на думку І.А. Марзалюка, такое дубляванне i зместу, i канцэпцыi ўсё ж адбывалася i, разам з тым, не атрымлiвала належнага асвятлення развiццё iнстытуцый дзяржавы ад старажытнасцi да сучаснасцi [2]. Дысцыплiна “Гiсторыя беларускай дзяржаўнасцi” i была заклiкана асвятлiць менавiта гэтыя аспекты i тым мусiць радыкальна адрознiвацца ад папярэдняй дысцыплiны.

Пры тым, што “Гiсторыя беларускай дзяржаўнасцi” выкладаецца студэнтам усiх спецыяльнасцей, у тым лiку i гiстарычнага профiлю, папярэднi вопыт працы выявiў шэраг асаблiвасцей, уласцiвых для студэнцкай аўдыторыi менавiта негiстарычных спецыяльнасцей. Безумоўна, цi не галоўнай такой асаблiвасцю з’яўляецца нiзкi ўзровень пазасталых школьных ведаў з гiсторыi Беларусi. Для студэнтаў негiстарычных спецыяльнасцей як дзённай, гэтак i завочнай форм навучання, нiзкi ўзровень як гiстарычных i ўвогуле гуманiтарных ведаў з’яўляецца хутчэй нормай. Гэта, безумоўна, ускладняе i замаруджвае ўспрыняцце i засваенне вучэбнага матэрыялу, якi павiнны быў абапiрацца на атрыманыя ў школе веды. Асаблiва гэта адчуваецца менавiта падчас лекцый, калi студэнты толькi пачынаюць засвойваць вучэбны матэрыял i iснуюць натуральныя абмежаваннi часу i паточнай аўдыторыi. Дадаткова ўскладняе ўспрыняцце матэрыялу яго мiждысцыплiнарны змест. Часткова гэта магчыма кампенсаваць выкарыстаннем камп'ютарных прэзентацый разам з неабходнымi каментарыямi.

Зразумела, што значную дапамогу заклiканы прынесцi рэкамендаваны Рэспублiканскiм саветам па гiстарычнай палiтыцы пры Адмiнiстрацыi Прэзiдэнта Рэспублiкi Беларусь вучэбны дапаможнiк “Гiсторыя беларускай дзяржаўнасцi” [3]. Аднак рэалiзавана яна можа быць, галоўным чынам, ужо пры падрыхтоўцы да семiнарскiх заняткаў, да таго ж выявiлiся iстотныя праблемы выкарыстання дапаможнiка ў студэнцкай аўдыторыi. Сярод iх – завялiкi аб’ём дапаможнiка. Для студэнтаў-першакурснiкаў аб’ём дапаможнiка ў 447 старонак, з улiкам выдаткаванага на дысцыплiну часу, амаль ўдвая перавышае аптымальны памер. Таму неабходна папярэдняя праца выкладчыка па адбору найбольш неабходнага матэрыялу для рэкамедацыi яго студэнтам. У пэўнай ступенi гэтая патрэба рэалiзавана падрыхтоўкай выкладчыкамi электронных вучэбна-метадычных комплексаў, створаных на аснове вучэбнага дапаможнiка “Гiсторыя беларускай дзяржаўнасцi”. Сёння яны даступныя на сайтах як ГДУ iмя Ф.Скарыны (хаця i размешчаны не аптымальна ўдала для пошуку), гэтак i на сайтах iншых ВНУ Беларусi.

Папаўненне аўдыторыi першакурснiкаў значнай колькасцю замежных студэнтаў стварае перад выкладчыкам новыя праблемы. Безумоўна, першай з iх з’яўляецца моўны бар’ер. Вучэбны дапаможнiк па гiсторыi беларускай дзяржаўнасцi i iншыя дапаможныя метадычныя матэрыялы даступныя сёння на беларускай мове, якую замежныя студэнты не разумеюць. У найблiжэйшым часе ўжо будзе даступная рускамоўная версiя вучэбнага дапаможнiка “Гiсторыя беларускай дзяржаўнасцi”, але гэта не здымае неабходнасцi стварэння рускамоўных дапаможных матэрыялаў па дысцыплiне. Акрамя таго, на цяперашнi час ужо даступныя ў кнiжным гандлi рускамоўныя дапаможнiкi па дысцыплiне, аўтарамi якiх з’яўляюцца беларускiя навукоўцы i выкладчыкi. Аўдыторыя замежных студэнтаў мае таксама iстотную спецыфiку ўспрымання вучэбнага матэрыялу, асаблiва той яго часткi, якая распавядае аб этапах развiцця беларускай дзяржаўнасцi. Для замежных студэнтаў, перад усiм туркменскiх, у меншай ступенi кiтайскiх, звесткi з гiсторыi

развіцця беларускай дзяржаўнасці і яе інстытутаў не знаходзяць аналогій у дзяржаўным развіцці іх родных краін. Недасканалае валоданне рускай мовай і адсутнасць гістарычных аналогій не дае ім магчымасці, адпаведна, рабіць для сябе параўнанні і адэкватна засвойваць вучэбны матэрыял дысцыпліны. Акрамя таго, відавочны ўплыў іншых гістарычных палітык, прынятых у гэтых краінах, нават постсавецкага Туркменістана, на ўспрыняцце вучэбнага матэрыялу. Для прыкладу, такія знакавыя для беларускага народа і беларускай дзяржаўнасці падзеі, як Вялікая Айчынная вайна, для замежных студэнтаў не маюць прынцыповай значнасці і сімвалічнага сэнсу. Гэта накладвае на выкладчыка дадатковыя высілкі – данесці да аўдыторыі не толькі фактычны, але і сімвалічны змест.

Акрамя асвятлення этапаў развіцця беларускай дзяржаўнасці, значная ўвага надаецца разгляду гісторыі развіцця дзяржаўных інстытуцый і фармавання галін улады. Гэты матэрыял па неабходнасці таксама абапіраецца на звесткі школьнага курса гісторыі Беларусі і далей развівае іх да разумення структуры і функцый сучасных інстытутаў дзяржаўнай улады Рэспублікі Беларусь. Тут пэўныя складанасці для разумення студэнцкай аўдыторыі ставарае разгляд судовай сістэмы Рэспублікі Беларусь, перад усім, у пытаннях функцый і паўнамоцтваў судовых органаў. Больш паспяхова ўспрымаецца “беларусазнаўчы” блок дысцыпліны, які прадстаўляе культурную, рэлігійную і этнічную разнастайнасць Беларусі, знаёміць з сучаснымі навуковымі поглядамі на паходжанне беларусаў і Беларусі. Тут з’яўляюцца большыя магчымасці для актывізацыі пазнавальнай дзейнасці, у тым ліку і замежных студэнтаў.

Асаблівую групу студэнцкай аўдыторыі ствараюць студэнты завочнай формы навучання. У адрозненне ад першакурснікаў дзённай формы, тут больш выразна прасочваюцца ўзроставыя, прафесійныя і адукацыйныя адрозненні, што ўплываюць на ўспрыманне і засваенне вучэбнага матэрыялу па гісторыі беларускай дзяржаўнасці. Істотным фактарам з’яўляецца значна зменшаны ў параўнанні з дзённым навучаннем аб’ём лекцыйных і семінарскіх гадзін. Як паказаў вопыт выкладання студэнтам завочнікам, наяўнасць запланаваных непасрэдна перад экзаменам кантрольнай работы, лекцыйнага і семінарскага заняткаў мае значны ўплыў на мабілізацыю студэнтаў і наступную паспяховасць здачы экзамена.

Спецыфіка выкладання дысцыпліны “Гісторыя беларускай дзяржаўнасці” студэнтам негістарычных спецыяльнасцей, такім чынам, павінна быць улічана як выкладчыкамі, гэтак жа і пры планаванні вучэбнага працэсу, што найбольш важна для завочнай формы навучання.

## Літаратура

1. История белорусской государственности : типовая учебная программа по учебной дисциплине для учреждений высшего образования: утв. Министерством образования Республики Беларусь 29.04.2022. Рег. № ТД-СГ.037/тип. / Министерство образования Республики Беларусь, Учебно-методическое объединение вузов по гуманитарному образованию ; сост.: П. И. Бригадин [и др.]. - Минск : РИВШ, 2022. - 2.12 с.

2. «Гісторыя беларускай дзяржаўнасці». Даведаліся, пра што новы курс і чым адметны падручнік: гутарка з І. Марзалюком: Минск-Новости [Электронны рэсурс]. Рэжым доступа: https://minsknews.by/gistoryya-belaruskaj-dzyarzha%D1%9Enasczi-davedalisya-pra-shto-novy-kurs-i-chym-admetny-padruchnik/. – Дата доступа: 27.01.2024.

3. Гісторыя беларускай дзяржаўнасці : вучэбны дапаможнік для студэнтаў устаноў вышэйшай адукацыі / [І. А. Марзалюк і інш.] ; пад агульнай рэдакцыяй І. А. Марзалюка. – 2-е выд., стэрэатыпнае. – Мінск : Адукацыя і выхаванне, 2023. – 447 с.: партр., карты, іл. – (Сацыяльна-гуманітарны цыкл. Базавы кампанент).